# «КАЛІ ЖОНКІ ЎЖО ДАЎНО ВЫГРЫЗЛІ ПЯЧОНКІ...»



**За што купіў, за тое прадаю. Гэта цяпер не ў модзе, але ж...**
**Кажуць, Перамогу святкавалі ўсе і паўсюль. Ну яшчэ б — пасля гэткай вайны...**
**Пры штабе Ракасоўскага таксама банкет адбыўся. Распачаў яго сам маршал тостам:**
**— За таварыша Сталіна! За вялікага палкаводца, за арганізатара...**
**— А я піць не буду, — пачулася раптам з кута.**
**— Як гэта вы не будзеце?! — не паверыў вушам сваім маршал і двойчы Герой, памкнуўшыся ў бок адшчапенца. — Чаму?**
**— А ў мяне пакуль не наліта, — ціха прамовіў той...**
**Пры чым тут хлопцы ў лодцы?**
**Ды ні пры чым — на першы погляд, але ж калі прыглядзецца ды ўключыць фантазію...**

Якраз гэта і робяць нашы чытачы: доўга ўглядаюцца ў здымак (кіньце вочкам на верхні), потым — прыдумваюць подпісы... Як вам, напрыклад, вось гэты, настальгічны, ад **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавіччаў**:

*Снег зямельку ўкрывае*
*Белай коўдрай,*
*цёплым лістам.*
*А на здымку —*
*праплывае*
*Лодка, поўная турыстаў...*
*Я на хлопцаў пазіраю*
*І пра лета ўспамінаю.*

Гэта, згадзіцеся, добры занятак. За такім — як бачыш, зіма праляціць. І зноў наступіць лета.

Зрэшты, не: спачатку будзе вясна, можа, нават з разлівам, як некалі:

*Падышла рака да хаты,*
*Дык Пахом наш —*
*за лапату...*
*У лодку пасадзіў*
*суседзяў,*
*Хоць без вёсел,*
*але ж «едзе»,*
*Трохі шляху ўжо агораў...*
*Дзякуй дзядзьку*
*валанцёру!*

Кажа гэтае слова **спадар Іван Астроўскі з Мінска**. Яго жонка, **спадарыня Ніна**, у нечым з мужам згаджаецца, у нечым — не. Ну, сапраўды:

*Як ні моста, ні дарогі —*
*Прападзеш без дапамогі:*
*А таму ўсе ў паводку*
*Выглядалі ў далі лодку.*
*Яе гналі два няўмекі,*
*Бо ніякай жа бяспекі!..*
*Хто з бяды вось так*
*ратуе,*
*Той сабою рызыкуе.*

Ну яшчэ б: столькі пасажыраў на борце... Да таго ж не драбненькіх...

У пошуце між тым ёсць радкі і пра іх: у прыватнасці — ад **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**:

*Ратаваў зайцоў Мазай,*
*Добры дзед быў,*
*не гультай.*
*Лодка поўнаю плыла —*
*Дно ў рэчцы не скрабла...*
*Бо кампанія ў Мазая*
*Не такая ўжо і цяжкая...*
*І Мацей, каб плыў удвух,*
*То матор бы не заглух!*

З ім, з гэтым маторам, як лічыць **спадарыня Гудачкова**, праблемы часта здараюцца:

*Федзя лодку*
*змайстраваў,*
*На «агледзіны» сазваў.*
*Хлопцы радасна:*
*«Жывём...*
*Мы да дзевак*
*паплывём!»*
*Ды ля берага ракі*
*Дружна селі «маракі»*
*...Тут заўсёдная*
*прычына:*
*«Сапсавалася машына».*

Што затым было, ведае **спадар Мікола Кісель з Мінска**:

*Рулявы загнаў на глей?*
*З лодкі, хлопцы, і жывей:*
*Не ўтрымаў ваш човен*
*ношы,*
*Дык карміць вам зараз*
*вошай.*

Мала хто, мусіць, ведае, што гэта за «звяры»? Таму — радок са слоўніка: «вош — дробнае насякомае, якое паразітуе на целе чалавека...» Іх карміць (як і блох ды клапоў) — значыць, трапіць у незайздросныя ўмовы...

Што крыўдна, — часам па сваёй жа віне:

*Падурэць дзядзькі хацелі*
*Удзевяцёх у човен селі...*
*І нагамі налягалі,*
*І рыдлёўкай заграбалі...*
*Усё ўпустую: селі глуха.*
*Дзе дурнеюць,*
*там і скруха.*

Што праўда, тое праўда (грэх не згадзіцца са **спадарыняй Гудачковай**). Хоць выключэнне з гэтага правіла таксама ёсць. І згадвае пра яго **спадарыня Чыгрынава**:

*Запрасіўшы ўсіх на фэст,*
*Каласкі задалі тэст:*
*Каб не ехалі, не йшлі,*
*Не ляцелі, не плылі...*
*Далі рады мужыкі:*
*Завіталі ў Аўцюкі!*

Ну што тут сказаць? Малайцы — і госці, і гаспадары (іх завуць каласкамі ды калінкамі)! Вартую справу зрабілі: падтрымалі фестываль беларускага гумару, бо самі, відаць, гумарысты. Ці не?

«Час ад часу на сайце прыродаахоўнай інспекцыі, — піша **спадар Іван Сіманёнак з Пастаў**, — сустракаюцца паведамленні пра зусім не жартоўныя штрафы ў дачыненні да «чорных капальнікаў» — шукальнікаў скарбаў. Але тыя не дужа на іх зважаюць, яны, як героі Джэка Лондана, плывуць насустрач удачы:

*Пра барысаўскі*
*«кландайк»*
*Абвясціла плётка,*
*І аматары «за так»*
*Абляпілі лодку.*
*На бяспеку — напляваць*
*І на штраф драконаўскі,*
*Бо наперадзе, відаць,*
*Скарб напалеонаўскі!*

Пра шукальнікаў яго і радкі **спадарыні Іны Алісевіч з Уздзеншчыны**:

*«Даўно рамантыкі*
*звяліся»...*
*Сцвярджаць такое —*
*ці не грэх?*
*Па скарбы хлопцы*
*падаліся,*
*Адно — сабраліся*
*наспех».*

Ці на смех?

Але ж самае галоўнае (тобок рыдлёўкі) яны, заўважце, пабралі!

(Адзін з «капальнікаў» — не чорных, расказвалі, рубель аднойчы знайшоў (дома, у гародзе). Якія-ніякія грошы: узрадаваўся, палажыў яго ў кішэню. Разоў колькі капнуў, — бачыць, яшчэ адзін... І яшчэ... Разоў з 20 вось так нахіляўся, падымаў, цешыўся, што на жылу натрапіў: нехта рассыпаў! А потым насцярожыўся: нешта ж не звіняць гэтыя рублі? Ён руку ў кішэню, а там... дзірка).

Пра яе ж, калі ўдумацца, і радкі **сужэнцаў Астроўскіх**:

*Дзед Максім*
*і дзед Талаш*
*Возяць моладзь*
*на кірмаш,*
*Год працуюць і другі,*
*Бізнес маюць — неблагі,*
*Пакрываюцца выдаткі...*
*І ні гуку пра падаткі...*

А значыць, рана ці позна накрыецца іхняя «лавачка». Як, дарэчы, і ў іншых прадпрымальнікаў. Пра аднаго — піша **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды**:

*Хоць ты гвалтам тут*
*крычы —*
*Ніхто плаваць не вучыў,*
*Бо басейна ў нас няма*
*І задоўгая зіма...*
*Што дзядзьку без розніцы:*
*Ён па нас не позніцца,*
*Грошы — вёсламі грабе,*
*І, вядома ж, пад сябе.*

Што крыўдна (паводле тых жа **сужэнцаў Астроўскіх**), парушаючы правілы бяспекі:

*Дзед Максім і дзед Пахом*
*Абслугоўваюць паром,*
*І каб «зверху» мець даход,*
*Шмат каго*
*вязуць у брод...*
*Гэта — бізнес?*
*Не, афёра!*
*Во дзе трэба*
*кантралёраў!*

І з усімі адсюль наступствамі, пра якія, глянуўшы на здымак, напісала **спадарыня Вера Жук з Гродна**:

*Не шкадуе Бог багатых,*
*Ім таксама шле бяду:*
*Грэблі грошыкі лапатай,*
*А цяпер грабуць ваду.*

Крызіс — нічога не скажаш. І ў іх таксама. Каб падчас яго выжыць, людзям трэба перасесці з асабістага транспарту на грамадскі, адмовіцца ад абедаў у кавярнях (перакус можна браць у слоічках), прадукты купляць па акцыях, адзенне — на распродажах, у кіно хадзіць раз на месяц...

Слушнае пытанне: «А калі нехта вось гэтак і да крызісу жыў, то што?»

Няма адказу. Ёсць хіба канстатацыя факта: «Грошы, як кісларод: многа іх — галава пачынае кружыцца, мала — задыхаешся». І тады ўжо хоць-нехаць шукаеш выйсце.

Адно з іх убачыў на здымку **спадар Мікалай Старых з Гомеля**:

*Як у нашага суседа*
*Спадзяюцца ўсе*
*на дзеда:*
*«Дзеда, грошай трохі*
*дай...»,*
*«Дзед, на лодцы*
*пакатай...»*
*...Пройдзе час, і хтосьці,*
*можа,*
*Тому дзеду дапаможа?*

Хацелася б верыць...

Выйсце другое — ад **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны**:

*Плачуць жонкі-Пенелопы,*
*Бо сказалі мужыкі:*
*— Пададзімся й мы*
*ў Еўропу,*
*Як мігранты, напрасткі...*
*Грэблі ціха, аднатонна:*
*Не чуваць ніводзін гук!..*
*Абышлі ўсе кардоны!*
*Але іх... «злавіў»*
*Кляшчук.*

Значыць, не ўдаўся пераход? Вернуцца мужы?

Што вернуцца, вядома ж, добра. Што без еўрапейскіх заробкаў — дрэнна. Але ж хоць жывыя-здаровыя, а маглі б (паводле **спадара Сабалеўскага**) і не:

*То не бежанцы-арабы,*
*Не кітайцы к нам плывуць —*
*Старшыня паслаў*
*прараба*
*«Кантрабанду*
*правярнуць»:*
*Вельмі танны спірт*
*расейскі*
*Хтосьці на фуры зноў*
*прывёз...*
*Разальюцца потым рэкі*
*Ад жаночых горкіх слёз.*

А, магчыма, і ўжо разліліся? Мо, па іх гэты човен і плыве?.. Яшчэ і таму, што слёзы праліваюцца, дзе трэба, а дзе і не трэба. (Анекдот да слова: «Дачушка, чаму ты не хочаш замуж за Васю?» — пытаецца маці. — «Дык ён жа руды...» — «Глупства, — адгукаецца бацька. — Ён з табой як ажэніцца, тут жа сівее). А калі і пажыве... То міжволі пагодзішся са **спадаром Мурашкам з Брэста**:

*Калі жонкі ўжо даўно*
*Выгрызлі пячонкі,*
*Уцякаюць мужыкі —*
*І наперагонкі.*

Уцякаюць (гляньце на здымак) без вёслаў, без рэчаў, ды што там — нават без партак, толькі б хутчэй, толькі б далей. А ўжо там...

Там, як і варта чакаць, іх сустракаюць... іншыя жанкі, прычым — радасным:

*Ах, якія хлопцы*
*Прыплылі на лодцы!*
*Гэткіх зроду не было!*
*Калі ласка, у сяло!*
*Шмат работы ў нас*
*на фермах*
*Ёсць дыхтоўныя дамы.*
*І дзяўчат, у шлюбе*
*верных,*
*У акрузе знойдзем мы.*

Абяцае гэта **спадарыня Зоя Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна**. Прычым яе заўвага пра вернасць тут досыць дарэчная. «Уявіце сцэну, — прапануе **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**, — муж паехаў у камандзіроўку, да жонкі прыйшоў каханак, удваіх яны збіраюць на стол. «Можа б ты нажы навастрыў? — пытае гаспадыня. — А то ў майго бязмена вечна часу няма». «І мне ж таксама... І я дома не вастру, — з жахам думае мужчына. — А нажы між тым не тупыя. Значыць, жонцы іх нехта точыць?»

Гэта — так бы мовіць — перадгісторыя, празаічныя радкі ад **спадара Валерыя**. А ёсць яшчэ і паэтычныя — цэлы роздум на тэму:

*Здымак...*
*Некалькі слоў з нагоды:*
*Мужы ў нас —*
*што той Адысей,*
*Абы не выхоўваць*
*дзяцей,*
*Бягуць ды шукаюць*
*прыгодаў.*
*Ад іх адвыкаюць жонкі:*
*І свой, і як быццам*
*чужы —*
*Прыедзе —*
*ды есць пячонкі:*
*«Хто вострыць нажы?*
*Кажы!..»*

Адтуль, відаць, «жыць на нажах» — быць у варожых адносінах? Што, вядома ж, цяжка — хоць на працы, хоць у сям'і. Лепш было б — ладзіць. А вось як? «Інструкцыя» ад **спадарыні Жук**:

*Не варта мужа пілаваць*
*Ды мозг яму выносіць...*
*І ля спадніц яго трымаць,*
*Калі ён волі просіць...*
*На рыбу хоча?*
*Хай плыве,*
*Ідзе на паляванне,*
*І недзе чарку хай глыне...*
*Абы «прыплыў»*
*да рання.*

Гэтыя, у лодцы, трэба разумець, прыплываюць? Ці ўсё ж такі адплываюць? Тады адкуль? На думку **спадарыні Абакунчык з Мінска**, з... рэдакцыі газеты «Звязда»!

*Сто гадоў...*
*Ці ж не нагода,*
*Каб сабралася на-ро-ду...*
*Нехта йшоў, а нехта —*
*ехаў...*
*Кампліменты поўным*
*мехам:*
*Як умелі — віншавалі,*
*Сто гадоў яшчэ жадалі!*
*Выпівалі, нешта елі*
*І дадому не хацелі.*

Але ж паплылі (на жаль).

Чаму па вадзе? Не вам казаць, на вуліцах Мінска заторы, а Свіслач пакуль не загружана. Чаму нехта ў шапцы, а нехта без? Дык, напэўна ж, пілі шапковую. (Гэта, калі ў гасцях дужа добранька, так, што ад'язджаць не хочацца, тады шапку з галавы — і ў кут са словамі: «А-ай, халера з ім! Застаюся!»). Чаму на карме не моладзь, а людзі сталыя? Чаму з рыдлёўкамі і, мякка кажучы, раздзетыя?..

Адказы на гэтыя пытанні чытач можа, калі захоча, прыдумаць сам. Бо ўжо ж прыдумаў, што ў лодцы турысты, гумарысты, чорныя капальнікі, гора-ратавальнікі і прадпрымальнікі, шукальнікі работы і прыгод, пакрыўджаныя мужы, абы-якія бацькі, мігранты, новыя беларусы, перасяленцы ў вёску...

І нам застаецца хіба павітаць іх, усіх (тым жа дасціпным: «Ах, якія хлопцы...») ды, як заўжды напрыканцы, узгадаць мінулы конкурсны здымак. На ім (гл. нумар «Звязды» за 21 кастрычніка) жанчына ў бок запраўкі вяла дзвюх кароў...

Дык вось, на думку вялікага чытацкага журы, найлепшыя подпісы да гэтага фота прапанавалі **спадарыні Любоў Чыгрынава з Мінска, Вера Жук з Гродна і Іна Алісевіч з Уздзеншчыны**.

Высокую адзнаку атрымалі і радкі **спадароў Валерыя Гаўрыша з Чавусаў і Віктара Сабалеўскага**.

Вось з гэтым, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» (на першы квартал 2018 года) накіроўваецца ў слаўны горад Узда.

Вы хацелі б, каб найстарэйшая беларуская газета прыходзіла і да вас? Тады дзейнічайце: афармляйце падпіску альбо ўважліва глядзіце на новы конкурсны здымак, думайце, складайце подпісы (дасціпныя і не больш за восем радкоў) і дасылайце іх у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**
dounar@zviazda.by



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.